Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
+TV ПРАГРАМА
22 ЛІСТАПАДА 2024 г. ПЯТНІЦА № 228 (30362)


ПА ВЕДЫ — З КАМФОРТАМ 4


ЖЫВАЯ АБО ШТУЧНАЯ? 5

## КОРАТКА

• **26 лістапада ў Культурна-спартыўным цэнтры УП «Мінскае аддзяленне чыгункі» (вул. Чкалава, 7) адбудзецца гарадскі кірмаш вакансій, які арганізаваны камітэтам па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама.**

**У мерапрыемстве возьме ўдзел каля 100 арганізацый Мінска розных сфер дзейнасці. Таксама будуць працаваць тэматычныя секцыі. Час правядзення — з 10:00 да 13:00.**

• Больш за 1,6 тыс. фур чакаюць на граніцы ўезду ў ЕС.

• **Больш як 60 працэнтаў тэхнікі Мінскага аўтамабільнага завода экспартуецца ў Расію.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Дзяніс МАРОЗ, намеснік міністра энергетыкі:**

*«Пытанне развіцця атамнай энергетыкі ў Беларусі цяпер на парадку дня. На гэту тэму ўвесь час гаворыць кіраўнік дзяржавы. Пытанне патрабуе сістэмнага аналізу і прыняцця канчатковага рашэння. У Міністэрства энергетыкі ёсць задача ад урада па распрацоўцы тэхніка-эканамічнага абгрунтавання. Мы вывучаем перспектывы, бачым трэнды дастаткова бурнага росту спажывання электрычнай энергіі. Калі мы сумесна з вучонымі прыйдзем да разумення, што гэтыя трэнды ўстойлівыя, тады, вядома, тэхніка-эканамічнае абгрунтаванне нам пакажа, наколькі эфектыўным можа быць або будаўніцтва новага энергаблока атамнай станцыі на існуючай пляцоўцы, або стварэнне яшчэ адной станцыі на новай пляцоўцы».*

З першых вуснаў

# «ПРАБЛЕМЫ, ЯКІЯ ТУРБУЮЦЬ ЛЮДЗЕЙ, ДЛЯ МЯНЕ ВЕЛЬМІ ВАЖНЫЯ»

## За што кіраўнік дзяржавы ўдзячны ініцыятыўнай групе і на што арыентуе яе членаў


Фота БелТА.

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з кіраўніком і каардынатарамі ініцыятыўнай групы, якія прадстаўляюць усе вобласці і горад Мінск. З ініцыятывай арганізаваць работу па зборы подпісаў у падтрымку дзеючага кіраўніка дзяржавы для вылучэння кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь выступіла Федэрацыя прафсаюзаў. Кіраўніком ініцыятыўнай групы стаў старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Юрый Сянько.**

Сустрэчу Аляксандр Лукашэнка пачаў са слоў падзякі за работу членаў ініцыятыўнай групы. «Я гэта вельмі цаню. Кожны дзень мяне інфармуюць аб сітуацыі ў нашай ініцыятыўнай групе. Але так складваліся абставіны, што не мог раней сустрэцца з вамі з прычыны тых мерапрыемстваў, якія праходзілі. І цяпер «напружанка» такая, але папрасіў, каб усе мерапрыемствы адтэрмінавалі, усё ж такі я павінен быў з вамі сустрэцца. Упэўнены, што наша размова па максімуме дойдзе да кожнага члена ініцыятыўнай групы», — сказаў ён. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ведае, наколькі гэта цяжкая праца: «Я сам калісьці гэтым займаўся, у першыя свае выбары. Трэба было хадзіць да людзей. Я не проста там кантраляваў нешта, я браў падпісныя лісты, хадзіў да людзей, на пікетах стаяў, каб людзі бачылі ўжывую маладога чалавека, які рызыкнуў кінуць выклік магутнай машыне і вылучыў сваю кандыдатуру кандыдатам у Прэзідэнты».

Прэзідэнт заўважыў, што без работы ініцыятыўнай групы не будзе кандыдатаў у Прэзідэнты. «Калі няма подпісаў у падтрымку кандыдата ў Прэзідэнты — значыць, няма гэтага кандыдата. Таму гэта найважнейшая работа», — адзначыў ён. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што фізічна не можа сустрэцца з усімі членамі ініцыятыўнай групы, якіх каля 17 тысяч. Таму папрасіў каардынатараў перадаць словы падзякі ўсім, хто працуе.

«Я таксама ўдзячны федэрацыі прафсаюзаў і вам, Юрый (старшыня федэрацыі прафсаюзаў Юрый Сянько. — «**Зв.**»), за тое, што вы вылучылі ініцыятыву заняцца гэтай найцяжэйшай працай, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Для мяне гэта таксама было праблемай, шчыра кажучы, я і з Адміністрацыяй раіўся, што будзем рабіць і як будзем рабіць. А яны раптам кажуць, што прафсаюзы гатовы выканаць гэтую работу.

СТАР. 2

Па сезоне

## Як падрыхтаваць аўтамабіль да зімы?

**Многія аўтаўладальнікі лічаць, што напярэдадні зімы дастаткова змяніць летнюю гуму на зімовую, купіць «незамярзайку» і шчотку для змятання снегу. Аднак гэтага недастаткова. Падрыхтоўка машыны — сур'ёзны працэс. Што яшчэ трэба абавязкова праверыць? Чым адрозніваецца зімні стыль кіравання? На якіх участках дарогі варта быць асабліва ўважлівым кіроўцам і што павінны памятаць пешаходы? Ці складаней зімой прайсці тэхагляд? На гэтыя і іншыя пытанні адказалі эксперты.**

СТАР. 4



Спажывец

## САМАЕ СМАЧНАЕ

### Што новага прэзентавалі вытворцы прадуктаў харчавання на «Прадэкспа-2024»

**Спажыўцоў, вядома, цікавіць пытанне: што новага, карыснага і смачнага з'явіцца на прылаўках і ў нашых халадзільніках у найбліжэйшы час? Традыцыйна «Прадэкспа» славіцца багаццем дэгустацый і шырокім харчовым асартыментам: прадукты штодзённага рацыёну, далікатэсы, святочныя закускі, функцыянальнае харчаванне. Тут можна пакаштаваць інавацыйныя прадукты і навінкі вытворчасці, якіх часам яшчэ няма на прылаўках крам. Мы і пакаштавалі: ацэньвалі ўсе чатыры выставачныя дні, якія ў сталіцы праходзіла «самая смачная падзея года». І зараз гатовы падзяліцца ўражаннямі.**

СТАР. 13



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

ISSN 1990 — 763X
24228
9 771990 763008

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!
# У НОВЫ ГОД – З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ
Ідзе падпіска на I квартал і I паўгоддзе 2025 года.
Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2025 года, у падарунак календыры: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.


# «ПРАБЛЕМЫ, ЯКІЯ ТУРБУЮЦЬ ЛЮДЗЕЙ, ДЛЯ МЯНЕ ВЕЛЬМІ ВАЖНЫЯ»





*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Я падумаў: «Дзякуй богу, не трэба групу ствараць і нешта думаць». Гэта вельмі важна. І я ўжо сказаў, што вельмі ўдзячны ўсім вам, каардынатарам і тым групам, якія створаны ў рамках ініцыятыўнай групы. Вы не лічыцеся з часам. Ведаю, што вельмі акуратна і асцярожна гэта робіце, нікога не прымушаеце і не ціснiце. Гэта правільна. Правільна, бо нам гэта не патрэбна. Абсалютна не патрэбна. І каб не ствараць потым лішніх пытанняў, прыходзіцца вельмі акуратна ў гэтым кірунку дзейнічаць».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што той аб'ём сабраных подпісаў, а іх ужо больш як 1,5 мільёна, — гэта катастрафічная работа. Ён прызнаўся, што не чакаў, што так будзе. «Таму я папрасіў бы вас, а вы ўжо самі вызначыцеся. Не трэба напружваць членаў ініцыятыўнай групы, каб яны бегалі, перанапружваліся, бегалі па дамах за людзьмі і чагосьці прасілі ці ўладкоўвалі лішнія пункты збору подпісаў. І так сабрана дастатковая колькасць. Таму не трэба. Каб нас крытыкавалі: «А вось Прэзідэнт, натуральна, тут націснулі ці кагосьці прымушаюць». Усё роўна скажуць. Няхай гэта будуць фэйкі, а не праўда. Мы законы выконваем», — адзначыў ён.

Збор подпісаў працягваецца да 6 снежня. Аляксандр Лукашэнка спытаў парады ў ініцыятыўнай групы: працягваць яго ці спыняць? Але ў той жа час, як заўважыў кіраўнік дзяржавы, спыняць будзе няправільна, бо людзі могуць папракнуць. «6 снежня, значыць, да 6 снежня мы недзе павінны прысутнічаць, каб людзі ахвотныя маглі прыйсці і распісацца», — адзначыў ён.

Асобна кіраўнік дзяржавы звярнуўся да журналістаў. Па яго словах, калі нехта з кандыдатаў у Прэзідэнты захоча выступіць у СМІ, расказаць, як праходзіць збор подпісаў, — трэба даць ім такую магчымасць. Калі яны гэтага жадаюць. «Каб выконвалася раўнавага. А то зноў будуць папракаць: «А вось Прэзідэнт тут сабраўся...» Справа нават не ў тым, колькі подпісаў сабралі. Для мяне важна, як ідзе гэты збор, што людзі кажуць. Для мяне гэта важна як для Прэзідэнта, што можа быць не важна для іншых кандыдатаў. А для мяне важна. Але, тым не менш, няхай кожны скажа, як ідзе збор подпісаў. Хаця б па некалькі хвілін, як у мяне тут яны могуць выказацца», — адзначыў ён.

Аляксандр Лукашэнка заклікаў членаў ініцыятыўнай групы не баяцца фэйкаў і шматлікіх укідаў, якіх у гэты электаральны перыяд будзе нямала. Па яго словах, дадзены перыяд трэба прайсці дастойна.

## «Гэта добры сацыялагічны зрэз»

Самым галоўным у працы членаў ініцыятыўнай групы Прэзідэнт назваў зносіны з людзьмі падчас збору подпісаў. Ён папрасіў сабраць інфармацыю, аб чым людзі кажуць, на што трэба звярнуць увагу. «Гэта добры сацыялагічны зрэз. Лепшага не бывае. Толькі праўдзіва мне напішыце аб тым, што добрага людзі сказалі, двума радкамі. І ўсё астатняе, што патрабуюць людзі, што дрэннага, з іх пункту гледжання. Гэта вельмі важна. Праблемы, якія турбуюць людзей, для мяне вельмі важныя. І мы будзем, натуральна, у гэтым кірунку працаваць і выпраўляць тыя недахопы, якія людзі заўважаюць», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся работай ініцыятыўнай групы. Ён таксама параіў звяртаць увагу на заўвагі, паколькі зборам подпісаў работа не абмяжоўваецца. «Мы павінны выглядаць дастойна, паколькі кандыдат у Прэзідэнты — дзейны Прэзідэнт, і з яго спытаюць», — заўважыў ён.

Старшыня Федэрацыі прафсаюзаў і кіраўнік ініцыятыўнай групы Юрый Сянько далажыў, што ўсе неабходныя працэдуры, звязаныя з рэгістрацыяй ініцыятыўнай групы і яе дзейнасцю, праводзіліся ў поўнай адпаведнасці з законам, спецыялісты былі падрыхтаваны поўнасцю. Па яго словах, збор подпісаў праводзіўся на ўсіх участках, дазволеных законам. Гэта і пікеты, працоўныя калектывы, пакватэрны падыход. «Усе магчымыя спосабы давалі і сёння даюць адпаведныя вынікі», — далажыў кіраўнік ініцыятыўнай групы.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота БелТА.**

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПРЫНЯЎ З ДАКЛАДАМ КІРАЎНІКА АДМІНІСТРАЦЫІ ПРЭЗІДЭНТА

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Дзмітрыя Крутога. Разгледжаны ход падрыхтоўкі да правядзення ў пачатку снежня ў Мінску пасяджэння Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы, а таксама пытанні арганізацыі маючых адбыцца замежных візітаў беларускага лідара.

Прэзідэнт трымае на кантролі будаўніцтва Мінскага міжнароднага выставачнага цэнтра. Аб гэтым Дзмітрый Крутой таксама падрабязна далажыў кіраўніку дзяржавы.

Яшчэ адна тэма — змяненне заканадаўства, якое датычыцца работы і паўнамоцтваў старшынь райвыканкамаў. Гэтае пытанне абмяркоўвалася на пасяджэнні Прэзідыума Усебеларускага народнага сходу. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў важнасць аператыўнай дапрацоўкі і больш хуткага прыняцця дакумента. Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта далажыў, як арганізавана работа па гэтым пытанні.

### У тэму

## Мы адзіныя і накіраваны на тое, каб захаваць у нашай краіне парадак

Журналістам Юрый Сянько расказаў, што ініцыятыўная група будзе працягваць сваю работу, таму што ёсць звароты ад людзей, якія пакуль не могуць прыйсці на пункты збору подпісаў. Некаторыя працоўныя калектывы самі просяць членаў ініцыятыўнай групы прыйсці да іх на прадпрыемства. Гэтая форма работы будзе працягвацца. У той жа час Прэзідэнт папрасіў не напружваць сітуацыю, а ўладкаваць пункты збору подпісаў там, дзе гэта сапраўды неабходна. «То-бок, мы выберам аптымальныя месцы. Напрыклад, цэнтры гарадоў, грамадскія прыёмныя, якія бяруць на сябе функцыю збору подпісаў, — падкрэсліў Юрый Сянько. — Будзе працягнута работа па зборы подпісаў у калектывах, пакватэрным абыходзе і будуць працягваць работу некаторыя пікеты».

Кіраўнік ініцыятыўнай групы падкрэсліў, што ўсе яе члены ведаюць заканадаўства, якое рэгламентуе збор подпісаў за вылучэнне кандыдатаў у прэзідэнты, і працуюць выключна ў рамках гэтага заканадаўства, не даючы ніякіх падстаў для крытыкі. «Мы выдатна разумеем, што апаненты выкарыстоўваюць і фэйкі, укіды, якія ідуць з-за мяжы. Яны, як і ў 2020 годзе, ідуць на тое, каб дэстабілізаваць абстаноўку і ўнесці ў інфармацыйную прастору нашай краіны інфармацыю, якая зусім не адпавядае рэчаіснасці. Наша задача, у тым ліку і ініцыятыўнай групы, — растлумачваць людзям, як насамрэч ідуць справы ў нашай краіне, у тым ліку і са зборам подпісаў. І члены ініцыятыўнай групы яшчэ раз сарыентаваны ні ў якім разе не паддавацца на фэйкі, а прайсці выбарчую кампанію прыгожа, выразна, без страху ўкідаў звонку. Мы іх абсалютна не баімся», — заявіў Юрый Сянько.

Кіраўнік ініцыятыўнай групы адзначыў, што беларусы цудоўна ведаюць біяграфію дзеючага Прэзідэнта, бачаць, што ён рабіў раней і што робіць цяпер: «Людзі пераканаы, што гэтыя падыходы не будуць мяняцца. Менавіта з такімі пасыламі людзі пакідаюць подпісы за Прэзідэнта нашай краіны ва ўпэўненасці, што захаваюцца тыя падыходы ў пытаннях руху нашай краіны наперад. Адзінства духа ў нашай краіне адчуваецца. І члены ініцыятыўнай групы з абласцей таксама адзіныя ў ацэнцы таго, што адбываецца ў рэгіёнах. Мы адзіныя і накіраваны на тое, каб захаваць у нашай краіне парадак і тыя падыходы, якія былі вызначаны раней». Юрый Сянько таксама расказаў, што часта людзі дзеляцца з членамі ініцыятыўнай групы бытавымі, бягучымі праблемамі накшталт замены лямпачак у пад'ездзе, тарыфамі на электраэнергію, рамонтамі дарог і іншымі. Па яго словах, людзям у дапамозе не адмаўляюць і ўсе гэтыя пытанні адразу накіроўваюцца для вырашэння ў адпаведныя ведамствы.

Намеснік старшыні Гродзенскага абласнога аб'яднання прафсаюзаў Святлана Майніна адзначыла, што людзі, якія ставяць подпісы за Аляксандра Лукашэнку, упэўнены ў заўтрашнім дні і не гатовы яго страціць. «Тыя, хто прыходзяць на пікеты, зусім свядома, мэтанакіравана і ставяць свой подпіс, разумеюць, што гэта не проста росчырк пяра: яны дэманструюць сваю грамадзянскую пазіцыю і падтрымку дзеючага кіраўніка дзяржавы. Сёння многія выдатна ўсведамляюць, што краіна ідзе правільным курсам. І мы хочам гэтым курсам ісці далей», — падкрэсліла яна. Святлана Майніна паабяцала, што абавязкова перадасць словы падзякі ад Прэзідэнта ўсім членам ініцыятыўнай групы. «Мы праводзім вельмі шмат пікетаў, людзі вельмі стараюцца і працуюць з натхненнем, таму што бачаць пазітыўны водгук нашых грамадзян. Гучыць шмат слоў падзякі на адрас дзеючага кіраўніка дзяржавы, складваецца вельмі добразычлівая атмасфера», — расказала яна.

Каардынатар ініцыятыўнай групы па вылучэнні Аляксандра Лукашэнкі кандыдатам у Прэзідэнты, старшыня Віцебскага абласнога аб'яднання прафсаюзаў Юрый Дзяркач звярнуў увагу, што кожны чалавек, аддаючы свой подпіс за вылучэнне кандыдатам дзеючага Прэзідэнта, робіць гэта не таму, што яго нехта папрасіў, а таму, што не жадае страціць тое, што на дадзены момант мае. «Чалавек бачыць, як змянілася краіна, яго рэгіён, як працуе медыцына, адукацыя... У людзей ёсць упэўненасць, што іх дзеці змогуць самарэалізавацца ў нашай краіне, змогуць зарабіць сабе на жыццё», — зазначыў ён. Юрый Дзяркач расказаў, што нярэдкія выпадкі, калі пажылыя людзі, якія не маюць магчымасці самастойна прыйсці на пікет і паставіць свой подпіс, тэлефануюць з просьбай даслаць члена ініцыятыўнай групы дадому. Яны хочуць падтрымаць вылучэнне кандыдата, з якім звязваюць будучыню сваю і сваіх дзяцей», — падкрэсліў Юрый Дзяркач. Па яго словах, бывае, што ад грамадзян паступаюць прапановы, напрыклад, адносна паляпшэння работы спажывецкай кааперацыі і іншых службаў. Усе яны акумулююцца ў органах мясцовай улады і пры неабходнасці ўлічваюцца ў далейшай працы. Юрый Дзяркач адзначыў, што такім чынам у дзяржаве забяспечваецца зваротная сувязь паміж чыноўнікамі і народам, улада чуе людзей, іх прапановы, ініцыятывы і сувымярае, як зрабіць так, каб стала лепш. «Бо чалавек доўга знаходзіцца ў нязручным становішчы не можа. Таму, калі мы робім так, як трэба людзям, забяспечваем узаемадзеянне іх з дзяржавай, тады людзі будуць трымацца за дзеючую ўладу, будуць давяраць ёй і імкнуцца сваёй працай зрабіць так, каб было камфортна і добра», — падкрэсліў ён.

Міжнароднае супрацоўніцтва

# ШЛЯХАМ ПЛЁННАГА ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ

## Што абмяркоўвалі парламентарыі краін СНД

**Беларуская парламенцкая дэлегацыя на чале са Старшынёй Савета Рэспублікі Наталляй КАЧАНАВАЙ 21—22 лістапада ўдзельнічае ў чарговым пасяджэнні Савета і 57-м пленарным пасяджэнні Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў у Санкт-Пецярбургу. Праграма мерапрыемстваў надзвычай насычаная. Беларускія парламентарыі ўзялі ўдзел у рабоце пастаянных камісій МПА СНД, Міжнароднай канферэнцыі «30 гадоў міжнароднага назірання за выбарамі ў СНД: вопыт і практычныя вынікі» і Маладзёжнай міжпарламенцкай асамблеі дзяржаў — удзельніц СНД.**



### Нельга дапусціць скажэння гісторыі

Безумоўна, цэнтральнай падзеяй першага дня прадстаўнічага форуму стала пасяджэнне Савета Міжпарламенцкай Асамблеі СНД. Парламенцкія дэлегацыі абмеркавалі ўдзел міжнародных назіральнікаў ад МПА СНД у маніторынгу электаральных працэсаў, вынікі правядзення буйных кангрэсных мерапрыемстваў Асамблеі і іншыя пытанні.

На пачатку пасяджэння прайшлі выбары Старшыні Савета Міжпарламенцкай Асамблеі СНД, аднагалосна на гэту пасаду была пераабрана Старшыня Савета Федэрацыі Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі Валянціна Матвіенка.

Значным дакументам, прынятым кіраўнікамі парламентаў краін Садружнасці, стаў зварот у сувязі з 80-й гадавінай Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гадоў. У ім гаворыцца, што кожная Саюзная рэспубліка ў поўнай меры адчула на сабе ўсе нягоды вайны, зрабіла свой унёсак у дасягненне гістарычнай перамогі над фашызмам і нацызмам. Сёння, нягледзячы на палітычныя, эканамічныя, нацыянальна-этнічныя адрозненні, Вялікая Перамога па-ранейшаму з'яўляецца адной з галоўных асноў, якія аб'ядноўваюць народы краін Садружнасці, найважнейшай духоўнай каштоўнасцю, маральным арыенцірам для ўсіх пасляваенных пакаленняў.

У звароце адзначаецца, што Савет Міжпарламенцкай асамблеі дзяржаў — удзельніц СНД выступае за ўмацаванне міжнароднага супрацоўніцтва ў справе захавання гістарычнай памяці шляхам падтрымання ў належным стане мемарыялаў, музеяў і архіўных матэрыялаў, звязаных з Другой сусветнай вайной; правядзення сумеснай скаардынаванай ваенна-мемарыяльнай работы па аднаўленні імёнаў савецкіх воінаў, якія пахаваны ў брацкіх магілах; недапушчэння знішчэння помнікаў і актаў вандалізму ў дачыненні да воінскіх пахаванняў і забеспячэнне бесперашкоднага доступу да іх незалежна ад іх месцазнаходжання.

Падчас абмеркавання дакумента Наталля Качанава адзначыла, што прыняцце звароту — гэта не проста адно з найважнейшых пытанняў на пасяджэнні Савета, а свяшчэнны абавязак перад шматнацыянальным савецкім народам, які дзякуючы мужнасці і гераізму і цаною велізарных страт атрымаў перамогу ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, абараніў наша з вамі права на жыццё, на свабоду, на мірнае неба над галавой. «Мы павінны не толькі прымаць падобныя звароты, але мы будзем актыўна ўдзельнічаць ва ўсіх мерапрыемствах, якія запланаваны па лініі Асамблеі. Нам трэба згуртавацца, асабліва цяпер, калі нашчадкі тых, хто прайграў, наўмысна скажаюць гісторыю, прыніжаюць унёсак нашых народаў у разгром фашызму, калі назіраецца ўсплёск неанацысцкіх настрояў у розных частках свету», — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі.

Таксама падчас работы Савета МПА Наталля Качанава праінфармавала прысутных аб тым, што назіральнікі ад Міжпарламенцкай асамблеі СНД будуць ажыццяўляць маніторынг выбараў Прэзідэнта ў Беларусі. Каардынатарам групы міжнародных назіральнікаў ад МПА СНД будзе прадстаўнік Расійскай Федэрацыі. Як было адзначана на пасяджэнні, сакратарыят Савета МПА СНД прыступіць да фарміравання маніторынгавай групы, у склад якой увойдуць прадстаўнікі парламентаў краін — удзельніц Асамблеі, службовыя асобы МПА СНД і эксперты Міжнароднага інстытута маніторынгу развіцця дэмакратыі МПА СНД.

### Пашыраецца міжпарламенцкае ўзаемадзеянне

Старшыня Савета Рэспублікі таксама правяла шэраг сустрэч з калегамі з іншых краін. Так, яна сустрэлася са **Старшынёй Савета Федэрацыі Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі Валянцінай МАТВІЕНКА.**

Бакі выказалі задавальненне ўзроўнем двухбаковага ўзаемадзеяння. У кантэксце таго, што ў пачатку снежня гэтага года будзе адзначацца 25-годдзе стварэння Саюзнай дзяржавы, было падкрэслена: міжпарламенцкае супрацоўніцтва Беларусі і Расіі ў поўнай меры адпавядае пастаўленым прэзідэнтамі дзвюх краін задачам па паглыбленні інтэграцыйных працэсаў. Пашыраецца міжпарламенцкае ўзаемадзеянне, пад эгідай Савета Федэрацый і Савета Рэспублікі эфектыўна рэалізоўваюцца важныя для нашых краін праекты.

Наталля Качанава і Валянціна Матвіенка абмеркавалі падыходы да фарміравання праграмы XIII Форуму рэгіёнаў Расіі і Беларусі ў Ніжнім Ноўгарадзе і ключавыя мерапрыемствы, прымеркаваныя да 80-годдзя Вялікай Перамогі.

Спікеры таксама адзначылі паспяховую рэалізацыю ініцыяванага расійскімі і беларускімі парламентарыямі культурна-адукацыйнага праекта «Цягнік Памяці», да якога з кожным годам далучаецца ўсё большая колькасць старшакласнікаў з краін постсавецкай прасторы.

### Умацаванне сяброўскіх адносін

Яшчэ адна сустрэча — са **Старшынёй Мілі Меджліса Азербайджанскай Рэспублікі Сагібай ГАФАРАВАЙ.** На пачатку размовы Наталля Качанава павіншавала азербайджанскі народ з праведзеным палітычна важным мерапрыемствам — выбраннем парламента. Яна зазначыла, што беларускія назіральнікі на выбарах вярнуліся з вельмі добрымі ўражаннямі і далі надзвычай высокую ацэнку электаральнай кампаніі.

«Вядома, добрыя адносіны паміж нашымі краінамі шмат у чым залежаць ад нашых прэзідэнтаў. Аляксандр Рыгоравіч заўсёды кажа, што закрытых тэм паміж Беларуссю і Азербайджанам няма. Усе пытанні, якія абмяркоўваюцца нашымі лідарамі, нацэлены на супрацоўніцтва паміж краінамі і народамі, умацаванне сяброўскіх адносін абсалютна па ўсіх напрамках: у гандлёва-эканамічным, гуманітарным, сацыяльным, і што для нас вельмі важна, міжпарламенцкім супрацоўніцтве», — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі.

Таксама яна згадала афіцыйны візіт Сагібы Гафаравай у нашу краіну, адзначыўшы, што ён быў надзвычай плённым. «Я хацела б вярнуцца да пытання падпісання новага міжпарламенцкага пагаднення, думаю, што гэта будзе правільна, мы абновім наша супрацоўніцтва, падыходы ў рабоце, тым больш што нам ёсць пра што сказаць. У нас сапраўды сёння складваюцца цудоўныя вынікі ў гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве», — сказала Наталля Качанава.

Закранулі бакі і тэму выбараў Прэзідэнта Беларусі ў наступным годзе. Старшыня Савета Рэспублікі выказала надзею, што калегі з краін СНД прымуць удзел у назіранні за выбарамі. «Мы будзем запрашаць нашых калег па лініі МПА СНД, асамблеі АДКБ, Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі», — зазначыла спікер. Таксама яна згадала пра агульную гісторыю беларускага і азербайджанскага народаў: «Мы разам адстаялі свабоду і незалежнасць Савецкага Саюза, а значыць, кожнай краіны паасобку. Таму, вядома, мы будзем шчыра рады, калі моладзь з Азербайджана ў наступным годзе зноў будзе ўдзельнічаць у такім важным праекце, як «Цягнік Памяці». Акрамя таго, у 2025 годзе мы прымаем маладзёжны форум «Дзеці Садружнасці» і вельмі спадзяёмся, што моладзь з Азербайджана таксама будзе ў нас», — заўважыла Наталля Качанава.

У сваю чаргу Сагіба Гафарава адзначыла, што парламенцкія сувязі Беларусі і Азербайджана могуць служыць прыкладам для многіх краін.

### Нацэленасць на развіццё

На сустрэчы **са Старшынёй Сената Олій Мажліса Рэспублікі Узбекістан Танзілай НАРБАЕВАЙ** абмяркоўваліся акцэнты міжпарламенцкага ўзаемадзеяння і супрацоўніцтва. «Палітыка, якая праводзіцца ў вашай краіне, накіравана перш за ўсё на людзей. Мы ўпэўнены, што працягнем наша плённае супрацоўніцтва на карысць нашых народаў і нашых краін», — адзначыла Наталля Качанава. І дадала: «Вядома, мы нацэлены на далейшае супрацоўніцтва, і я хачу запэўніць вас, што мы шчыра чакаем вас, вашых калег, дэлегацыю на III Жаночым форуме. Мы ўжо вызначыліся: гэта будзе Віцебская вобласць, горад Віцебск». Старшыня Савета Рэспублікі ўдакладніла, што трэці беларуска-ўзбекскі Жаночы бізнес-форум адбудзецца ў жніўні наступнага года.

Таксама Наталля Качанава нагадала, што ў 2025 годзе будзе адзначацца 80-годдзе Вялікай Перамогі — «нашай сумеснай Перамогі ў барацьбе з нацызмам», — і выказала надзею, што, як і раней, моладзь Узбекістана будзе актыўна ўдзельнічаць у памятных мерапрыемствах і праектах.

### Парламенцкі патэнцыял

Таксама на палях восеньскай сесіі МПА СНД адбылася яшчэ адна знакавая сустрэча — прыярытэтныя кірункі супрацоўніцтва Наталля Качанава абмеркавала са **Старшынёй Сената Парламента Рэспублікі Казахстан Мауленам АШЫМБАЕВЫМ.** Акрамя таго, разглядаліся пытанні палітычнага дыялогу паміж Беларуссю і Казахстанам. Бакі адзначылі значны патэнцыял парламентаў па ўмацаванні беларуска-казахстанскіх адносін.

**Паводле прэс-службы Савета Рэспублікі.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Аналітыкі чакаюць далейшага падаражэння золата



Золата можа падаражэць да $2900 за унцыю да канца 2025 года, прагназуюць аналітыкі UBS (найбуйнейшы фінансавы холдынг Швейцарыі). Паводле іх меркавання, такія фактары, як прыход да ўлады ў ЗША Дональда Трампа і ўзрослая глабальная нявызначанасць працягнуць падтрымліваць цэны на каштоўны метал. Да канца 2026 года кошт можа падняцца да $2950 за унцыю, мяркуюць эксперты. Золата сёлета стала адным з самых прыбытковых сыравінных тавараў, устанавіўшы некалькі рэкордаў да таго, як цэны адкаціліся пасля прэзідэнцкіх выбараў у ЗША. Рост каціровак каштоўнага металу быў абумоўлены павелічэннем пакупак цэнтральнымі банкамі свету, пераходам Федэральнай рэзервовай сістэмы да змякчэння грашова-крэдытнай палітыкі і геапалітычнай напружанасцю ў Еўропе і на Блізкім Усходзе. Як вядома, днямі Goldman Sachs апублікаваў прагноз, згодна з якім золата падаражэе да $3000 за унцыю да канца 2025 года.

### У ЗША прапанавалі абавязаць чыноўнікаў хадзіць на работу пяць дзён на тыдзень



Амерыканскі прадпрымальнік Ілан Маск і бізнесмен Вівек Рамасвамі, якія павінны ўзначаліць новы дэпартамент па дасягненні дзяржэфектыўнасці (DOGE), прапануюць абавязаць федэральных дзяржслужачых хадзіць на работу пяць дзён на тыдзень. Гэта вынікае з іх сумеснага артыкула для газеты Wall Street Journal, паведамілі РІА «Новости». «Патрабаванне да федэральных служачых прыходзіць на работу пяць дзён на тыдзень прывядзе да хвалі добраахвотных звальненняў, якія мы вітаем: калі федэральныя служачыя не хочуць прыходзіць на работу, амерыканскія падаткаплацельшчыкі не павінны плаціць ім за прывілею часоў COVID — сядзець дома», — адзначаецца ў артыкуле. DOGE раней аб'явіў аб пошуку супрацоўнікаў для ведамства, сярод умоў — звышвысокі IQ і гатоўнасць працаваць больш за 80 гадзін у тыдзень.

### Карціна Рэнэ Магрыта прададзена на аўкцыёне за рэкордныя $121,2 млн



Палатно бельгійскага мастака-сюррэаліста «Імперыя святла» прададзена на аўкцыёне Christie's у Нью-Ёрку за $121,2 млн. Гэта рэкордны кошт для карцін Магрыта, а таксама першы з пачатку года твор мастацтва, які пайшоў з малатка больш чым за $100 млн. Напісаная ў 1954-м карціна ацэньвалася ў $95 млн. Яна дасталася ананімнаму пакупніку, які ўдзельнічаў у таргах па тэлефоне. «Імперыя святла» — серыя з 17 аднолькава названых палотнаў, на якіх намаляваны дамы сярод дрэў. Характэрнай асаблівасцю з'яўляецца тое, што дамы і дрэвы намаляваны ў начным святле, пры гэтым неба над імі — у дзённым. Прададзеная Christie's карціна з'яўляецца самай вялікай у серыі — вышынёй каля 1,2 метра.

# Як падрыхтаваць аўтамабіль да зімы?

## ЧАС «ПЕРААБУВАЦЬ» КОЛЫ

Каб не трапіць у ДТЗ з надыходам замаразкаў, неабходна падрыхтаваць свой аўтамабіль. І першае, з чаго трэба пачаць, — колы. Ад іх якасці залежыць не толькі бяспека дарожнага руху, але і асабістая бяспека вадзіцеляў.

— Згодна з правіламі дарожнага руху, з 1 снежня да 1 сакавіка ўсе транспартныя сродкі пры ўдзеле ў дарожным руху павінны быць абсталяваны зімовымі шынамі, — адзначыла **часова выконваючая абавязкі начальніка аддзялення арганізацыі міжведамаснага ўзаемадзеяння і прапаганды бяспекі дарожнага руху галоўнага ўпраўлення ДАІ МУС Ганна БАНАДЫК.** — Пры гэтым надвор'е дыктуе сваe ўмовы і ўжо ёсць першыя замаразкі. Таму рэкамендуем загадзя пачаць сезонную змену шын, каб потым не стаяць у чэргах на шынамантажы і да 1 снежня ўжо быць поўнасцю падрыхтаваным.

Многія кіроўцы выкарыстоўваюць усесезонную гуму або працягваюць ездзіць на летняй. Спецыялісты звяртаюць увагу, што летняя гума нават на сухой дарозе не выконвае ўсе свае функцыі, а пры мінусавой тэмпературы дубее і перастае трымаць кантакт з дарогай.

— Электронныя прылады аўтамабіля ў выглядзе антыблакіровачнай сістэмы могуць не дапамагчы, калі счапленне з дарогай проста няма. На павароце альбо перад пешаходным пераходам можна не паспець своечасова затармазіць, — дадала Ганна Банадык.

З 27 лістапада да 5 снежня ДАІ правядзе рэспубліканскую прафілактычную акцыю «Мяняй свой стыль на зімовы!». 29 лістапада пад аналагічным дэвізам пройдзе адзіны дзень бяспекі дарожнага руху. Мерапрыемствы накіраваны на папярэджанне і прафілактыку ДТЗ у зімовых умовах, а таксама прапаганду выкарыстання зімовых шын.

Адметна, што да 1 снежня ДАІ засяродзіцца на інфармаванні вадзіцеляў аб асноўных рызыках і пагрозах бяспекі, а таксама аб неабходнасці сезоннай змены шын. А вось ужо з 1 снежня пачнуць кантраляваць падрыхтоўку транспартных сродкаў да зімовай эксплуатацыі. Асаблівая ўвага будзе ўдзяляцца праверцы абавязкова абсталявання аўтамабіляў зімовымі шынамі. Таксама будзе ажыццяўляцца кантроль за спраўнасцю колаў і шын.



Нагадаем, што за ўдзел у дарожным руху транспартных сродкаў, якія не абсталяваны зімовымі шынамі, а таксама маюць няспраўнасці колаў і шын, прадугледжана адказнасць у выглядзе штрафу да адной базавай велічыні. Паўторнае такое парушэнне на працягу года прывядзе да штрафу ў памеры ад дзвюх да пяці базавых велічынь.

Акрамя колаў важна ў цэлым падрыхтаваць транспартны сродак да зімы. Для добрага агляду неабходна забяспечыць спраўнасць дворнікаў, сістэмы абдзімання і ацяплення аўтамабіля, каб шкло не пацела. Варта таксама праверыць спраўнасць фар і ліхтароў, своечасова замяніць лямпачкі, а таксама не забываць чысціць іх ад бруду, снегу і лёду. Асвятленне аўтамабіля важнае не толькі для самога кіроўцы, але і для іншых аўтааматараў, каб транспартны сродак быў максімальна прыкметным на цёмнай дарозе. Таксама важна праверыць зарадку акумулятара, спраўнасць тармазной сістэмы, дапаможных электронных сістэм. Па магчымасці неабходна праверыць калодкі і ўсе тэхнічныя вадкасці, каб аўтамабіль не дастаўляў ніякіх нязручнасцяў.

## НЕБЯСПЕКІ ЗІМОВАЙ ДАРОГІ

Зімовая дарога — гэта слізкае пакрыццё, галалёдзіца, туман і ападкі ў выглядзе дажджу, снегу, мокрага снегу, якія пагаршаюць бачнасць. Таму кіроўцам важна быць уважлівымі і мяняць стыль кіравання на зімовы — больш спакойны і стрыманы. Варта выбіраць найбольш бяспечную хуткасць у канкрэтных умовах надвор'я, улічваючы, што падчас маршруту дарога можа мяняцца.

— За бяспечным участкам можа быць мокры ці абледзянелы, таму выбіраць варта бяспечную хуткасць. Калі дазволеная хуткасць 120, але вы адчуваеце, што аўтамабіль пачынае «плаваць», вядома ж, выбірайце меншую, — звярнула ўвагу прадстаўнік ДАІ.

Акрамя таго, важна папярэджваць іншых кіроўцаў пра свае манеўры загадзя і пазбягаць на слізкай дарозе непатрэбных перастраенняў, манеўраў і прытрымлівацца правіл абгонаў, а па магчымасці ўвогуле адмовіцца ад іх.



— Лепш спакойна ў агульным патоку даехаць да месца прызначэння, чым выйграць некалькі хвілін, падвяргаючы рызыцы сябе, сваіх пасажыраў і кіроўцаў сустрэчных аўтамабіляў, якія ўвогуле не чакаюць пагрозы на сваёй паласе, — парэкамендавала суразмоўніца.

Яшчэ адзін «біч» зімовых дарог — наезды на пешаходаў. Нярэдка яны адбываюцца на пешаходных пераходах.

— Пешаходы, у капюшонах і шапках, лішні раз не пераканаюцца ў бяспецы, а кіроўцы або трымаюць высокую хуткасць, або не паспяваюць своечасова затармазіць. А, як правіла, зімой у месцах, дзе аўтамабілям часцей за ўсё прыходзіцца прытармажваць, самая слізкая дарога — гэта пешаходныя пераходы, прыпынкі грамадскага транспарту, закругленні дарог і пад'ёмы. Таму важна пазбягаць рэзкіх паскарэнняў і тармажэнняў, загадзя тармазіць перад пешаходнымі пераходамі, праходзіць павароты на пастаяннай мінімальнай хуткасці, — адзначыла Ганна Банадык.

Пешаходам важна пераходзіць дарогу толькі ў дазволеных месцах, глядзець па баках, пераканаўшыся, што вас прапускаюць і ўсе машыны спыніліся.

— Ніхто не адмяняў самую эфектыўную прафілактыку ў цёмны час — святлоадбівальныя элементы. Здаецца, не засталося людзей, якія не ведаюць, што такое флікер, аднак некаторыя адносяцца да яго як да несур'ёзнага элемента. Пры гэтым няма нічога больш эфектыўнага, калі яго правільна насіць, каб ён не быў закрыты складкамі адзення ці парасонам. У такім выпадку вас бачна на адлегласці 400 метраў і ў кіроўцы ёсць рэальная магчымасць прыняць меры, — рэзюмавала Ганна Банадык.

**Начальнік упраўлення арганізацыі дзяржаўнага тэхнічнага агляду РУСП «Белтэхагляд» Міхаіл МІХАЛОЎСКІ** расказаў аб асаблівасцях праходжання дзяржтэхагляду зімой:

— Выходзячы з патрабаванняў тэхнічнага рэгламенту Мытнага саюза да праходжання дзяржаўнага тэхнічнага агляду, працэс праходжання кантрольна-дыягнастычных работ у зімовы перыяд практычна нічым не адрозніваецца ад дзяржтэхагляду ў астатнія перыяды часу, за выключэннем патрабаванняў, якія прад'яўляюцца да шын транспартнага сродку. У зімовы час дзяржаўны тэхагляд устанаўлівае патрабаванне па абсталяванні транспартных сродкаў зімовымі шынамі катэгорый M1 і N1. Як вядома, зімовыя шыны павінны ўстанаўлівацца на ўсе колы транспартнага сродку, мець адпаведную маркіроўку. Калі выкарыстоўваюцца шыпаваныя шыны, яны таксама павінны быць устаноўлены на ўсіх колах аўтамабіля.

## ДАРОЖНІКІ ДА ЗІМЫ ГАТОВЫ

У дарожных службаў падрыхтоўка да зімы пачынаецца ў вясенне-летні перыяд.

— Асноўнымі кірункамі падрыхтоўкі сталі бягучы рамонт вулічна-дарожнай сеткі, распрацоўка аператыўных планаў, навучанне персаналу, выбар і ўзгадненне месцаў часовага складзіравання снегу, падрыхтоўка вытворчых баз і памяшканняў, — расказаў **галоўны інжынер упраўлення «Цэнтр» ДВА «Гаррамаўтадар Мінгарвыканкама» Дзмітрый КЛІМОВІЧ.**

Сёлета ў сталіцы адрамантавана больш за 1,89 мільёна кв. м дарог. Гэта поўная замена пакрыццяў, уладкаванне ахоўных пластоў, ямачны рамонт пакрыццяў, ліквідаванне калейнасці, рамонт тратуараў. Так, з красавіка поўную замену пакрыцця праезнай часткі выканалі на 90 участках агульнай плошчай больш чым 1 млн кв. м.

— Для забеспячэння комплекснага ўтрымання вулічна-дарожнай сеткі Мінска ў зімовы перыяд работа прадпрыемстваў аб'яднання арганізавана кругласутачна ў двухзменным рэжыме. Штосутачна на работах па прыборцы снегу будзе задзейнічана больш як 700 адзінак тэхнікі і звыш 800 дарожных рабочых. Паводле стану на 1 лістапада, уся тэхніка была пераабсталяваная, пескасолеразмеркавальнікі прайшлі атэстацыю на мінімальныя пашпартныя нормы размеркавання супрацьгалалёдных матэрыялаў, — праінфармаваў Дзмітрый Клімовіч.

**Алена КРАВЕЦ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Рэгіёны

# Па веды — з камфортам

**У Гомелі з 1 снежня з'явіцца новы «бацькоўскі маршрут». Як будзе арганізавана гэта папулярная форма падтрымкі гомельскіх сем'яў з дзецьмі, вывучылі ўдзельнікі выязной нарады па пытаннях транспартнага забеспячэння.**



«Бацькоўскі маршрут» № 32 выйдзе на лінію для падвозу ў школы Савецкага раёна дзяцей з мікрараёна актыўнай жыллёвай забудовы — Шведская Горка. Увесь маршрут абсталяваны новымі аўтобуснымі прыпынкамі, забяспечана дадатковае асвятленне праезнай часткі і нанесена адпаведная разметка. Усё арганізавана так, каб дзеці не пераходзілі дарогу па некалькі разоў і каб было зручней дабірацца да прыпынку. Уладкаваныя пешаходныя дарожкі ад прыпынкаў транспарту да ўстаноў адукацыі. Плануецца, акрамя таго, нязначна змяніць маршрут аўтобуса № 51, каб ён падвозіў навучэнцаў 32-й школы.

Дарэчы, і расклад транспарту будзе арганізаваны з улікам пачатку і заканчэння ўрокаў у школах і працоўнага дня ў дзіцячых садках раёна. Такім чынам, будзе зручна дабірацца да навучальных устаноў і вяртацца назад як тым, хто вучыцца ў першую змену, так і навучэнцам другой.

Новы «бацькоўскі маршрут» праінспектавалі **старшыня Гомельскага аблвыканкама Іван КРУПКО, памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гомельскай вобласці Юрый ГОРЛАЎ, старшыня Гомельскага гарвыканкама Уладзімір ПРЫВАЛАЎ.** Кіраўнікі вобласці і горада, а таксама памочнік Прэзідэнта на свае вочы ўбачылі і прааналізавалі, як дарожная інфраструктура па арганізацыі аўтобуснага руху адпавядае бяспечным умовам для школьнікаў і іх бацькоў.

— Усё павінна быць зроблена так, каб людзям было камфортна, школьнікі не былі вымушаны лішні раз пераходзіць дарогу. Дарослыя павінны быць упэўненымі ў бяспецы дзяцей, — падкрэсліў падчас выязной нарады Іван Крупко.

Як было адзначана, усяго ў Гомелі працуе 11 «бацькоўскіх маршрутаў». Яны забяспечваюць падвоз дзяцей у навучальныя ўстановы з Новага Жыцця, Рамановічаў і Чырвонага Маяка. У верасні былі адкрыты падобныя рэйсы для падвозу дзяцей і іх бацькоў з Любенскага мікрараёна да прыпынку «Сочнечная» праз вуліцу Братоў Лізюковых.

Увогуле практыка арганізацыі транспарту такім чынам для абласнога цэнтра — не новая і вельмі папулярная. Падобныя маршруты былі наладжаны для падвозу дзяцей з новых мікрараёнаў і восенню мінулага года.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота ТК «Гомельшчына афіцыйна».**

# 250 «суразмоўцаў» Навума Гальпяровіча

**У суботу, 23 лістапада, на тэлеканале «Беларусь 3» у аўтарскім праекце заслужанага дзеяча культуры Рэспублікі Беларусь Навума Гальпяровіча «Суразмоўцы» гледачы пазнаёмяцца з 250-м госцем. Ім стане пісьменніца з Магілёўшчыны Жанна Міус.**

У 2018 годзе пісьменнік і публіцыст Навум Гальпяровіч задумаў праект «Суразмоўцы», у якім з запрошанымі гасцямі вядзе размову пра беларускую культуру. За шэсць гадоў колькасць гасцей праекта вырасла да 250 чалавек! Выпускаў праекта выйшла яшчэ больш. Сярод «суразмоўцаў» як знаныя літаратары, лаўрэаты Нацыянальнай літаратурнай прэміі або кіраўнікі Саюза пісьменнікаў Беларусі — Алесь Карлюкевіч, Алена Стэльмах, Аляксей Чарота, так і пачаткоўцы, якія толькі сёлета сталі сябрамі арганізацыі. Гэта, напрыклад, такія аўтары, як Максім Хацкевіч і Паліна Корнева. Калі з першымі вядучы разважае над актуальнымі праблемамі ў літаратуры або па-сяброўску над вечнымі філасофскімі пытаннямі, то з другімі гутарка ідзе пра сучасныя тэндэнцыі і літаратурныя інтарэсы моладзі, пра кнігі і гаджэты, якія спрабуюць існаваць разам.

Геаграфія праграмы таксама пашыраецца. Часам госці «Суразмоўцаў» перадольваюць сотні кіламетраў, каб завітаць на здымачную пляцоўку Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і сустрэцца з Навумам Гальпяровічам. Некаторыя выдатныя пісьменнікі, якія за гэты час пайшлі з жыцця (Аляксей Дудараў, Мікола Мятліцкі, Серж Мінскевіч), застануцца светлымі і ўсмешлівымі ў кадрах праграмы.

«Я хацеў бы пажадаць праграме «Суразмоўцы» працягваць і надалей сваю дзейнасць, бо мы бачым унікальную пляцоўку Беларускага тэлебачання, менавіта такога фармату, звязанага з культурай. Навум Гальпяровіч здольны вывесці кожнага чалавека на адкрытую размову, дзе можна ў прыняцці расказаць усё што заўгодна пра культуру і атрымаць ад гэтага асалоду», — адзначыў **Дзмітрый ГЕРАСІМЁНАК, загадчык кафедры гісторыка-культурнай спадчыны Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.**

Як згадана вышэй, юбілейнай госцяй праграмы стане пісьменніца, сябра Магілёўскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Жанна Міус. У яе творчай скарбонцы проза і зборнікі вершаў для дзяцей і дарослых. Акрамя таго, пісьменніца ладзіць сустрэчы і праекты з удзелам юнай аўдыторыі. Праграму з ёй можна ўбачыць на сацыякультурным у 16.25.

**Алена ДРАПКО.**

## ШАШКІ («Звязда»)

Выпуск № 231

З 1 да 11 лістапада ў Аланіі (Турцыя) праходзіў маладзёжны чэмпіянат свету па шашках-64. Беларускія шашысты зноў пацвердзілі свой высокі ўзровень. У хуткай праграме выйграна шэсць медалёў. «Залата» ўзяла Вікторыя Нікалаева (Д20). Уладзіслаў Валюк (Ю27) і Павел Бокій (Ю14) сталі сярэбранымі прызёрамі, Арцём Ціханаў (Ю17), Яўгенія Швед (Д17) і Мілана Лапчук (Д9) — бронзавымі. У маланкавай праграме чэмпіёнкай свету стала Яўгенія Швед. «Серабро» на рахунку Уладзіслава Валюка і Івана Невара, «бронза» — у Вікторыі Нікалаевай і Марка Акуловіча. У класічнай праграме на рахунку беларускіх спартсменаў сем медалёў. Чэмпіёнамі свету сталі Вікторыя Нікалаева (Д20), Яўгенія Швед (Д17) і Павел Бокій (Ю14), сярэбраныя медалі выйгралі Марыя Тараніна (Д27) і Эя Кахно (Д11), бронзавыя — Арцём Ціханаў (Ю17) і Іван Невар (Ю11).

2 лістапада ў Брэсце ў рамках фестывалю «Чорная пешка» адбыўся бліц-турнір па шашках-64, у якім узялі ўдзел 30 шашыстаў. Перамог Арцём Кажух (Драгічынскі р-н).

**№ 170**



**№ 170** Г. Андрэеў
Белыя простыя: g1, c3, h4, a5, b6, d6, h6 (7)
Чорныя простыя: f2, h2, e3, g3, f4, g7, d8, f8 (8)

**№ 171** Ю. Мурадаў
Белыя простыя: b2, a3, g3, f4, h4, g5, h6 (7)
Чорныя простыя: b4, c5, e5, b6, d6, a7, e7, g7, f8 (9)

**№ 172** В. Марцінкевіч
Белыя простыя: g1, f2, c3, g3, d4 (5)
Чорныя простыя: a3, h4, c7, f8, h8 (5)

**№ 173** В. Шулга
Белыя простыя: d4, c5, e5, d6, a7 (5)
Чорныя простыя: b2, d2, c3, g3, f4, g5, g7, f8 (8)

Кампазіцыі ў шашкі-100 складзены вядучым рубрыкі.

**№ 174**
Белыя простыя: 47, 49, 38, 40, 28, 18, 19, 13 (8)
Чорныя простыя: 36, 39, 30, 17, 20, 10, 2, 4 (8)

**№ 175**
Белыя простыя: 47, 45, 38, 39, 33, 26, 27, 24 (8)
Чорныя простыя: 36, 35, 30, 16, 18, 15, 8, 9 (8)

**№ 176**
Белыя простыя шашкі: 41, 36, 37, 38, 39, 40, 24 (7)
Чорныя простыя шашкі: 27, 28, 22, 19, 12, 13, 10 (7)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

**Праверце свае рашэнні: Выпуск № 230 ад 08.11.24.**

**№ 163** 1. d4-e5 a7:e7 2. e5-f6 d8:b6 3. f6:h6 h4-g3 4. h6-e3 g3-h2 5. e3-g1+

**№ 164** 1. g1-f2 e3:g1 2. c1:e3 g1:d4 3. c5:e3 a7:c5 4. g3-h4 d8:b6 5. f4-e5 f6:f2 6. h4:h4 c5-d4 7. h4-e7 f8:d6 8. h6:e3+

**№ 165** 1. b4-a5 e5:c3 2. a5:e5 d4:f6 3. h4:e7 f8:d6 4. h6:d2+

**№ 166** 1. 37-31 28:46 2. 06-01 26:37 3. 22-17 12:21 4. 01:05+

**№ 167** 1. 44-40 28:48 2. 47-42 48:46 3. 36-31 45:34 4. 06-01 26:37 5. 01:05+

**№ 168** 1. f2-g3 h2:f4 2. d4-e5 f4:b4 3. a7:e3 f6-e5 4. e3-f4 e5:g3 5. h4:f2+

**№ 169** 1. d4-c5 b6:d4 2. b4-c5 d4:b6 3. d2-c3 b2:d4 4. f2-e3 d4:f2 5. e1:g7 h6:f8 6. h4:d8 b6-c5 7. d8-f6 f8-e7 8. f6:d8 c5-d4 9. d8-g5 d4-c3 10. g5-c1+

Першымі дакладныя адказы даслалі: І. Ананіч (Гродна), В. Арцюхін, Э. Дамброўскі, П. і В. Шульгі (усе — Мінск), С. Рашэцін (Ашмяны), В. Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва — Мядзел), У. Панько (Камянец).

**Пішыце па адрасе: газета "Звязда", г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013**

**e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru**

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**





Анонс

# ЖЫВАЯ АБО ШТУЧНАЯ?

## Як выбраць ёлку да Новага года

**Да Новага года застаўся літаральна месяц. Самы час вызначыцца з выбарам ёлкі — галоўным атрыбутам свята. Сапраўды, сёння перад кожным, хто жадае адчуць дома казачны і святочны настрой, стаіць даволі сур'ёзны выбар: ставіць жывую ёлку, штучную альбо ўвогуле ўпрыгожыць сваю хату дрэвам у кадцы?**

### Жывая ёлка

Варыянт традыцыйны і правераны часам. Лясная прыгажуня без сумневу створыць атмасферу сапраўднага зімовага свята. Па-першае, калючую лясную прыгажуню ў дзяцінстве ўпрыгожваў амаль кожны.



Па-другое, гэта неверагодны і ні з чым непараўнальны водар! Уявіце сабе карціну: вы ходзіце па ёлачным базары, якія традыцыйна ладзяць у гарадах перад святам; на зямлю, ціха кружачыся, падае снег, а вакол навагодняя мітусня, смех, гарачыя спрэчкі аб форме і памеры дрэва, якое выбіраюць. Нарэшце вы знайшлі яго, самае-самае, купілі і — хутчэй дадому. І пакой напаўняецца пахам лесу, які, дарэчы, яшчэ і вельмі карысны, бо дрэва вылучае ў паветра шмат фітанцыдаў, якія абараняюць чалавека ад інфекцый.




Акрамя таго, ёлка з лесу — гэта каштоўная сыравіна. Пасля свята ёй можна знайсці прымяненне: для абагрэву хаты ў каміне ці печы, а іглiца выдатна падыходзіць для мульчыравання — пакрыцця глебы для паляпшэння яе якасцяў. Пад такой падсцілкай значна менш расце пустазелле, не заводзяцца смажўы, а фітанцыды абеззаражваюць глебу.



Аднак ёсць у варыянта з жывой ёлкай і пэўныя мінусы. Амаль галоўны з іх — патрэба ў пастаянным доглядзе. Лясной госці неабходна рэгулярна мяняць ваду, але і гэта не ратуе ад іголак, якія асыпаюцца. Вядома, і прыборку ў доме прыйдзецца рабіць значна часцей.

Каб паменшыць асыпанне іголак, рэкамендуецца дадаваць у ваду цукар або аспірын, а саму лясную прыгажуню пажадана ставіць як мага далей ад батарэй і абагравальнікаў.

Але для аматараў жывых ёлак сёння ёсць добрая альтэрнатыва — **дрэва ў кадцы**. Такая ёлка спалучае ў сабе плюсы апісаных вышэй варыянтаў: і ігліцай пахне, і месца для захоўвання шукаць не трэба, і не асыпаецца. Гэты варыянт таксама дазваляе захаваць жыццё дрэўцу: вясной яго можна перасадзіць у адкрыты грунт. Акрамя таго, набыццё дрэва ў кадцы спрыяе вырашэнню пытання незаконнай высечкі лесу пад Новы год. Дарэчы, каб не заахвочваць браканьераў, заўсёды цікаўцеся ў прадаўцоў пра ліцэнзію на права і гандаль хвойнымі.

### Штучная ёлка

Прыгожа і даўгавечна. Сінтэтычнае дрэва выбіраецца адзін раз на доўгі тэрмін. Аднак трэба памятаць: лепш выдаткаваць больш грошай і набыць галоўны атрыбут свята з якасных матэрыялаў. Па-першае, такая рэч праслужыць шмат гадоў, па-другое, танны пластык выраблены з матэрыялаў, якія змяшчаюць устойлівыя арганічныя забруджвальнікі, напрыклад фенолы.

Акрамя таго, якасная ёлка глядзіцца прыгажэй і рэалістычней. Так, водару хвоі, вядома, не будзе. Але гэтая праблема лёгка вырашаецца. Можна набыць адпаведныя араматычныя палачкі або свечкі, якія будуць не толькі прыемна пахнуць, але і ствараць утульную і святочную атмасферу. Свечкі лепш выбіраць з натуральнага воску, бо парафін з'яўляецца прадуктам перапрацоўкі нафты. Наўрад ці хто захоча ўдыхаць шкодныя рэчывы.

Сярод мінусаў штучнай ёлкі варта адзначыць цяжкасці з захоўваннем: ёй спатрэбіцца для гэтага месца, бо нават у складзеным выглядзе яна займае даволі шмат прасторы. Асабліва гэта датычыцца буйнагабарытных варыянтаў. У якасці альтэрнатывы пастаянным збіранням і разбіранням сінтэтычнае дрэва можна зрабіць элементам інтэр'ера. Але ў гэтым выпадку можа страціцца ўвесь святочны шарм.



Увогуле, вырашайце самі. Аднак памятайце, у перыяд зімовых свят у свеце штогод высякаецца каля 120 мільёнаў хвойных дрэў. А для таго каб ёлка вырасла хоць бы да двух метраў, патрабуецца каля сямі гадоў. Таму пры выбары навагодняга дрэва турбуйцеся не толькі пра сябе, але і пра стан нашых лясоў.

* * *

Падрабязней аб тым, як экалагічна ўтылізаваць ёлкі, выбраць бяспечныя дзіцячыя цацкі ў падарунак да навагодніх свят, чытайце ў штомесячным грамадска-палітычным, навукова-папулярным часопісе «Родная прырода». Падпісацца на яго можна праз аддзяленні сувязі «Белпошта» і на сайце Belpost.by, сістэму Belpressa.by, аўтаматызаваную сістэму АРІП і ў магазінах і павільёнах «Белдруку».

**Марыя САМАЛЬ.**

### Беларусь 1

**5.50 Меладрама «Хатняя работніца» (12+).**
**7.35** Клуб рэдактараў (16+).
**9.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**9.20** «Арсенал» (12+).
**9.55 Меладрама «Перапісаць каханне» (12+).**
**11.50** Беларуская супержанчына.
**12.20** Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**12.45** Вакол планеты.
**13.25, 22.35 Меладрама «Разбітыя сэрцы» (12+).**
**15.25 Меладрама «Цана памылкі» (16+).**
**19.10** «Героі» (6+).
**20.40** Навіны надвор'я.
**21.00** Галоўны эфір.

### АНТ

**7.00, 9.00, 16.00** Нашы навіны.
**7.10** «Народны ДАСТ» (16+).
**7.40** «Смех з дастаўкай додому» (12+).
**8.05** «Жыццё іншых» (12+).
**9.10** «Метэагід».
**9.35** «Здароўе» (16+).
**10.40** «Народны повар» (12+).
**12.00** «Наша смешнае жыццё». «Магія лікаў» (12+).
**12.50** «Па сямейных абставінах» (12+).
**14.00, 16.20 Фільм «Перакаты лёсу» (16+).**
**18.00** «Адзін у Адзін» (16+).
**20.00** Контуры.
**21.15 Фільм «Дочкі-мачахі» (12+).**
**1.05 Фільм «Спяшайцеся кахаць» (12+).**

### СТБ

**6.50** «Марная мітусня» (12+).
**8.20** Дак. праект «Назад у СССР» (16+).
**9.50** «Беларуская супержанчына».
**10.00** «Вялікі горад».
**10.30, 13.30, 16.30** Навіны «24 гадзіны».
**10.40** Дак. праект «Тайная гісторыя ежы» (12+).
**12.25** Дак. праект (16+).
**13.45, 17.00, 21.15 «Гарачая кропка». Серыял (16+).**
**16.45** «Сенат».
**19.30** «Тыдзень».
**20.50** «Слова і справа».
**21.00** «Спорт-таймер».
**23.25 «Гарачая кропка-2». Серыял (16+).**
**0.20** Дак. праект «90-я» (16+).

### МІР

**5.00, 4.15 Тэлесерыял «Райскі куток» (16+).**
**5.20** Мультфільмы (6+).
**7.00 Маст. фільм «Старыя-разбойнікі» (16+).**
**8.55** «Дыктар робіць» (16+).
**9.30** «ФазэндаЛайф» (6+).
**10.00, 16.00** Навіны.
**10.10 Маст. фільм «Кур'ер» (16+).**
**12.00, 16.15, 19.30, 1.00 Тэлесерыял «Аперацыя «Мухабат» (16+).**
**18.30, 0.00** Выніковая праграма «Разам» (16+).
**2.15** «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (16+).
**3.05 Маст. фільм «Не хадзіце, дзеўкі, замуж» (16+).**

### Першы Інфармацыйны

**5.00, 5.30, 8.40, 9.25, 10.30, 11.30, 12.25, 13.30, 14.40, 15.35, 17.30, 20.00, 20.30, 21.00, 22.00, 23.00, 1.00, 3.00** Навіны. Дайджэст.
**5.05, 5.35, 6.15, 7.10, 8.10, 14.50, 16.50, 0.25, 1.05, 2.20, 3.05, 4.20** Дзень спорту.
**5.15, 6.40, 10.10, 20.05** Спецыяльны рэпартаж (12+).
**5.45, 7.45, 8.45, 11.35, 14.25, 15.20, 22.15, 23.15** Актуальнае інтэрв'ю (12+).
**6.00, 0.00** Гімн.
**6.05, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00** Вынікі тыдня.
**6.25, 7.20, 9.20, 12.55, 19.45** Сусветная навука (12+).
**7.15, 12.30, 17.55, 19.50** Аўтарскі погляд (12+).
**8.20, 9.30, 10.35, 13.35, 19.15, 21.15, 22.30, 23.30, 3.10, 4.25** Тэлефільм (12+).
**9.00, 10.00, 11.50, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 15.40, 17.00, 19.00, 22.55** Навіны.
**11.00, 14.05, 0.30** Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**11.20, 14.45** Вам тэлеграм (12+).
**12.35, 15.45, 18.40, 1.10** Твой горад (12+).
**13.20, 17.20, 19.10, 21.55, 0.50, 3.50** Громаў LIVE (12+).
**16.00, 18.00** Вакол планеты (12+).
**17.35** Спецыяльны рэпартаж (16+).
**20.35** Зразумелая палітыка (12+).
**.05, 2.00, 4.00** Галоўны эфір.
**1.30, 2.30** Дак. фільм (12+).

### РТР—Беларусь

**6.50 Фільм «Не смей мне казаць «Бывай» (12+).**
**10.15** «Рэцэпт сапраўднага беларуса».
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.35** «Свае».
**11.50** «Гумарына-2024».
**14.30** «У пошуках ісціны».
**15.10 Серыял «Фантазёр».**
**15.40** «Ёсць дзяўчынка адна».
**17.00, 19.05** «Песні ад усёй душы».
**18.00** «Сіняя птушка».
**20.00** Весткі тыдня.
**21.00** «Акцэнты».
**22.00** «САСС упаўнаважаны заявіць».
**22.55** Масква. Крэмль. Пуцін.
**23.30** «Нядзельны вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

**6.10** «Астрапрагноз».
**6.15** Майстар-клас: як гэта зроблена? (6+)
**6.50** Сэнс жыцця (12+).
**7.20** Беларусы (6+).
**8.00, 10.00, 16.00** Сёння.
**8.20** «Навука побач» (6+).
**8.55** Беларуская супержанчына.
**9.05** VeloLove (6+).
**9.25** Ежа хоць куды (6+).
**10.20** Сямейная справа (6+).
**10.40** «Кватэрнае пытанне. Ву» (12+).
**11.15** «Першая передача» (16+).
**11.50** «Цуд тэхнікі» (12+).
**12.35** «Дачны адказ» (0+).
**13.30** «НашСпажыўНагляд» (16+).
**14.20 Фільм «Дзяўчынка шукае бацьку» (6+).**
**16.20** «Следства вялі...» (16+)
**18.05** «Новыя рускія сенсацыі» (16+).
**19.00** «Вынікі тыдня».
**20.20** Шоу «Аватар» (12+).
**23.00** «Зоркі сышліся» (16+).

### Беларусь 3

**7.05** «Царэўна-жабка». Мультфільм (0+).
**7.45** «Веды ў кубе».
**8.25 «Нядзельны тата». Маст. фільм (6+).**
**9.50** «Наперад у мінулае».
**10.30** «Беларуская кухня».
**10.55** «Нацыянальны хіт-парад».
**11.50, 20.00** «Культурны тыдзень».
**12.30** «Спяваю і ўсё паспяваю».
**12.55 «Баламут». Маст. фільм (12+).**
**14.25** «Я — мастак, я так бачу!» Алег Скавародка.
**14.50 «Тры таполі на Плюшчысе». Маст. фільм (12+).**
**16.10** Сімфанічны аркестр Белтэлерадыёкампаніі.
**17.00** «Суперлато».
**17.30** «Кадры жыцця».
**18.20 «Не можа быць!» Маст. фільм (12+).**
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.05 «Разведчыцы». Маст. фільм (16+).**

### Беларусь 5

**6.45** Футбол. Чэмпіянат Расіі.
**8.30** Міжнародны навуковы кангрэс «Каштоўнасці, традыцыі і навацыі сучаснага спорту».
**9.55, 22.10** Біятлон. Кубак Расіі. Змешаная эстафета.
**11.25** На спорце.
**11.45** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. ХК «Гомель» — «Шахцёр» (Салігорск).
**14.00** Футбол. Чэмпіянат Расіі. «Лакаматыў» (Масква) — ФК «Хімкі».
**16.00** Фіз-ра.
**16.25** Футбол. Чэмпіянат Расіі. «Зеніт» (Санкт-Пецярбург) — «Крылы Саветаў» (Самара). У перапынку — «Спорт-цэнтр».
**18.25** Баскетбол. Адзіная ліга. «ПАРМА» (Перм) — «Уралмаш» (Екацярынбург).
**19.25** Футбол. Чэмпіянат Расіі. ФК «Краснадар» — «Спартак» (Масква). У перапынку — «Спорт-цэнтр».
**21.30** Вынікі тыдня.
**23.45** Спорт-цэнтр.
**23.55** На спорце.

### Беларусь 2

**6.00** «Уключайся. Найлепшае за тыдзень» (12+).
**9.00, 10.35, 15.30** Тэлебарометр.
**9.05** «На нажах» (16+).
**10.05** Я з вёскі (12+).
**11.10** Смачна есці (12+).
**11.55** «Дзіця з пекла» (16+).
**13.20** «Дарослым не зразумець» (12+).
**14.20** «Мама дарагая!» (16+)
**15.35 Фільм «Канёк-Гарбунок» (6+).**
**17.30** «Уральскія пельмені» (16+).
**18.55 Драма «Цёмныя воды» (16+).**
**21.10** Спортлато 5 з 36, КЕНА.
**21.15 Серыял «ІП Пірагова» (16+).**



### 8 канал

**7.00** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05** Мультпарад.
**7.20** «Чапаеў».
**9.00** Серыял па вашых просьбах.
**11.20** «Дакументальны экран». «Паляванне і рыбалка».
**11.50** «Асалам алейкум, Беларусь!»
**12.00** Драма «Легенда» (6+).
**14.15** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**14.20** «Зімовая вішня» (16+).
**15.50** «Гістарычная драма».
**17.10** «Экспрапрыятары» (12+).
**18.50, 21.00** «Надвор'е».
**18.55** «Мажор» (16+).
**20.50** «Вечарніца» (0+).
**21.05** «Урокі Лазуркіна».
**21.10** Драма «Ахвяры кахання» (16+).
**22.55** Драма «Я застаюся» (16+).
**0.45** Баявік «Целаахоўнік» (18+).

### Культура

**6.30** «Пешшу...»
**7.05** Легенды сусветнага кіно.
**7.35** «Чорныя дзіркі. Белыя плямы».
**8.20** «Апошняя справа камісара Берлаха». Тэлевізійны фільм.
**9.30** Неўскі каўчэг. Тэорыя немагчымага.
**10.00, 12.30, 16.30, 19.30, 23.55** Навіны культуры.
**10.15** «Назіральнік».
**11.10, 1.35** ХХ стагоддзе.
**12.45** Навіны. Падрабязна.
**13.00** Лінія жыцця.
**13.55, 2.40** «Забытае рамяство». Дак. серыял.
**14.15** «Прыгажун-мужчына». Маст. фільм.
**15.25** «Агора».
**16.45** «Передзвіжнікі. Аляксандр Беграў».
**17.15** Майстар-клас.
**18.15** «Апавяданні з рускай гісторыі».
**19.00** Урокі рускай.
**20.00** Урачыстае адкрыццё XXV Міжнароднага тэлевізійнага конкурсу юных музыкантаў «Шчаўкунчык».
**21.35** «Саці. Нясумная класіка...»
**22.20** «Мегрэ». Тэлесерыял.
**0.10** Памяці Уладзіміра Мікушэвіча. «Магістр ігры». Аўтарская праграма.
**0.40** Прыступкі цывілізацыі.

### Настальгія

**5.55** Маст. фільм «Аршын Мал Алан» (16+).
**7.25** «Добры вечар, Масква!» (16+)
**9.00** «Быў час» (16+).
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР» (16+).
**11.00, 17.00, 23.00, 5.00** «Блеф-клуб» (18+).
**11.30, 12.35, 15.40, 17.30, 21.40, 23.25, 1.00, 2.50, 3.40, 5.30** Музычная настальгія (12+).
**12.00** «Сто пытанняў да дарослага». Дзмітрый Малікаў (16+).
**12.50** «Брава, Артыст!» (16+)
**14.25** «Рытмічная гімнастыка» (12+).
**15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**18.00** «СевАлогія» (18+).
**19.15** Маст. фільм «Монтэ-Карла» (16+).
**0.00** «Да і пасля...» (16+)
**1.10** Маст. фільм «Хроніка аднаго кахання» (16+).

### EuroSport 1

**3.30, 7.00, 10.30, 14.00, 15.45, 21.00, 21.45** Снукер (6+).
**5.00, 12.30, 1.35** Веласпорт-трэк. Ліга чэмпіёнаў (16+).
**9.00, 9.45** Горныя лыжы. Мужчыны. Кубак свету (16+).
**19.30** Паўэрліфтынг (6+).
**20.30** Скачкі на лыжах з трампліна (6+).

### Кінакамедыя

**2.05** «Тупы і яшчэ тупейшы 2». (16+).
**4.30** «Крымінальная фішка ад Генры» (16+).
**6.25** «Навагодні ол інклюзіў» (12+).
**8.05** «Астэрыкс і Абелікс супраць Цэзара» (12+).
**10.10** «Як я стаў рускім» (16+).
**12.00** «Астэрыкс і Абелікс у Брытаніі» (12+).
**14.05** «Скарбы джунгляў» (18+).
**15.40** «За Палыча!» (12+).
**17.25** «Малавіта» (16+).
**19.30** «Непаслушнікі» (12+).
**21.35** «Адам і Ева» (12+).
**23.15** «Вельмі дрэнныя матулі». (18+).

### ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**8.50** «Доктар І...» (16+)
**9.15, 16.40** «Арлінская» (16+).
**10.55** «Паглядзім» (16+).
**11.30** «10 самых» (16+).
**12.05** «Сны» (16+).
**12.40, 18.25, 02.35** «Сляпая» (16+).
**14.05, 19.50, 3.25** «Варажбітка» (16+).
**15.40** «Новыя містычныя гісторыі» (16+).
**21.30** «Справы жыццё-выя» (16+).
**23.25** «Я іду цябе шукаць» (16+).
**0.30** «Ганна Карэніна» (16+).
**4.15** «Глядзі сам» (16+).
**4.30** «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).

### ТБ1000

**6.15** У пагоні за ветрам (12+).
**8.00, 23.05** Забойствы ў ... (16+)
**10.00** Летуценнік (12+).
**12.15** Кунг-фу жарабец (16+).
**14.50** Авангард: арктычныя ваўкі (12+).
**17.00** Белфегор. Прывід Луўра (16+).
**19.00** Незвычайныя прыгоды Адэль (12+).
**21.05** Бібліятэкар: у пошуках дзіды лёсу (16+).
**1.05** Анжаліка, маркіза анёлаў (16+).
**2.55** Цудоўная Анжаліка (16+).
**4.35** Анжаліка і кароль (16+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**5.30** «Смяшарыкі» (6+).
**6.30** «Тры каты» (6+).
**7.15** «Царэўны» (6+).
**8.35** «Бар «МаскваЧыкі» (16+).
**10.35** «Гуляй, Вася! Спатканне на Балі» (16+).
**12.40** «Я багіня» (18+).
**14.45** «Пра любоff» (16+).
**17.00, 18.00** «Практыка» (16+).
**19.00** «Мафія: гульня на выжыванне» (16+).
**20.45** «За гранню рэальнасці» (16+).
**22.50** «Усё ці нічога» (16+).
**0.35** «Чараўнікі» (12+).
**2.15** «Каралева» (16+).
**3.35** «Маленькі воін» (6+).
**5.05** «Ненаглядны дапаможнік» (6+).
**5.15** «Зарадка для хваста» (6+).

### ЯСНАе

**5.25** Серыял «Мужчынская работа-2» (12+).
**7.00** Дак. фільм «Савецкія мафіі. Чараўнік Ізумруднага горада» (16+).
**7.45** «Паедзем пагудзім».
**8.40** «Чалавек і здароўе».
**9.00** Дак. серыял «Хронас».
**9.15** Серыял «Перавозчык» (16+).
**10.50** Серыял «Мянтоўскія войны-6» (16+).
**12.30** Серыял «Неадкладнае рэагаванне» (16+).
**14.15** Серыял «Сляпы. Зброя адплаты» (16+).
**15.55** Серыял «Неўскі-2. Праверка на трываласць» (16+).
**17.40** Серыял «Група Zeta» (16+).
**19.15** Серыял «Шэф. Гульня на павышэнне» (16+).
**21.00** «Ясна аб футболе».
**21.30** «Ясна аб хакеі».
**22.05** Серыял «Запаведны спецназ-2» (16+).
**23.45** Маст. фільм «Кіношнікі» (12+).
**1.25** Маст. фільм «Зграя» (12+).
**3.05** Маст. фільм «Мяне клічуць Арлекіна» (16+).

### ЗВЯЗДА

**6.00, 6.45, 7.30, 8.15** «Калі растаў снег» (12+).
**9.00, 9.45** «Снайпер. Апошні стрэл» (12+).
**10.30, 11.25** «Наркамаўскі абоз». Серыял (16+).
**12.20, 13.05** «Саракапятка» (16+).
**13.55** «Дняпроўскі рубеж». Маст. фільм (16+).
**16.10, 23.30** «Гарады-героі. Севастопаль». Дак. фільм (12+).
**17.15** «Асабістая справа».
**17.45, 18.35** «Воўчае сонца» (16+).
**19.30, 23.00** «168 гадзін».
**20.00, 20.45** «Контргульня» (16+).
**21.30** «Варыянт «Амега». Маст. фільм (12+).
**22.45** «Паміж мірам і вайной. Танкавае брацтва». Дак. фільм (12+).
**0.25** «Георгій Жукаў. Капкан для камкора». Дак. фільм (12+).
**0.55** «Беларускі вердыкт. Сябры і ворагі Фрыца Шменкеля». Дак. фільм (12+).
**1.25** «Джульбарс і Дзіна. Сабакі службы «Д». Дак. фільм (12+).
**1.55** «Бабруйскі вузел. Ліквідацыя». Дак. фільм (12+).
**2.25** «Віцебшчына. Партызанскі край».
**2.55** «Маленькія салдаты вялікай вайны». Дак. фільм (12+).
**3.25** «Ад Рузвельта — Сталіну. Беларусы ў справе на мільярд». Дак. фільм (12+).
**3.55** «Паміж мірам і вайной. Звязаныя вайной». Дак. фільм (12+).

*У праграме магчымыя змяненні. Передрукоўка праграмы забаронена. [СЦ] – фільм трансліруецца са скрытымі субцітрамі.*

# САМАЕ СМАЧНАЕ

## АДЧУЙ СЯБЕ ГУРМАНАМ

Насамрэч сыры — гэта ласунак, культавы прадукт у гурманаў. Ёсць гатункі сыру, якія выспяваюць па некалькі гадоў: іх абмываюць вінам, шаруюць соллю, беражліва гадуюць на іх ядомую цвіль, з імі нават размаўляюць сыраробы, бо іх якасць — гэта велізарная карпатлівая праца і... крыху шанцавання. На такія складаныя сыры беларускія сыраробы замахнуліся ўжо дастаткова даўно — і, здаецца, у іх атрымліваецца. Напрыклад, сыры Слуцкага сыраробнага камбіната ведаюць і цэняць у 26 краінах свету, у тым ліку ў Сербіі, Таджыкістане, Казахстане і нават у Грузіі, дзе моцныя і ўласныя традыцыі вытворчасці сыру. Сёлета на «Прадэкспа» слуцкія сыраробы прывезлі пармезан — адзін з найстарэйшых, найскладанейшых у вытворчасці (ён патрабуе года вытрымкі) і любімых гурманамі гатункаў, празваны «каралём сыроў». Дарэчы, пармезан выдатна праяўляе сябе ў пасце. Хоць добры ён і сам па сабе: востра-салёны, з фруктовым і арэхавым адценнямі смаку (вынік прысутнасці ў прадукце глутамінавай кіслаты, карыснай для нервовай сістэмы і галаўнога мозга).

Але пармезан — не самы складаны сыр ад слуцкіх сыраробаў. Новая распрацоўка прадпрыемства — мадэлан, вытрымка якога 24 месяцы.

— Тры гады таму мы заклалі пробную партыю, — распавёў **начальнік упраўлення збыту і продажаў ААТ «Слуцкі сыраробны камбінат» Вадзім ГАЛЕНЧЫК.** — Вынік спадабаўся.

Мадэлан мае яскравы салодкі, злёгку рэзкі смак з арэхавымі ноткамі і водарам, а лёгкая вастрыня набываецца ў працэсе выспявання сыру. Пакаштаваць яго пакуль не ўдалося, але першая прамысловая партыя мадэлану ўжо закладзена. І, верагодна, на наступным «Прадэкспа» ў гурманаў з'явіцца шанц ацаніць навінку ад «Яся Белавуса». Брэнд, дарэчы, быў створаны для знешняга рынку: ён сугучны са словам «беларус», а ў свядомасці замежных спажыўцоў існуе знак роўнасці паміж паняццямі «беларускі прадукт» і «высокая якасць».

У працяг тэмы сыроў: на дэгустацыях яны былі прадстаўлены ў вялізнай колькасці. ААТ «Мінскі малочны завод № 1» прэзентаваў чэдэр і імерулі. Імерулі — расольны сыр, традыцыйны інгрэдыент для хачапуры. Беларускі імерулі распрацоўваўся спецыяльна для кліента з Грузіі. У гандлёвых сетках нашай краіны ён таксама з'явіцца, але крыху пазней.

Рызыкнулі прывезці свае сыры на «Прадэкспа» і замежныя сыраробы, хоць і адзначалі, што канкураваць у гэтай сферы на беларускім рынку нялёгка.

— Але мы вырабляем рамесныя сыры, — распавёў **кіраўнік аддзела продажаў СППК «Вкус Севера» Аляксандр ЯСОНАЎ.** — Гэта натуральны прадукт на еўрапейскіх заквасках — французскіх, швейцарскіх. Нашы сыры нятанныя, але вельмі смачныя і могуць зацікавіць беларускага спажыўца.

Наведвальнікам «Вкус Севера» прапанаваў пакаштаваць на «Прадэкспа» груер па традыцыйнай швейцарскай тэхналогіі. Яго можна выкарыстоўваць у салатах, пастах, падаваць з напоямі і соусамі. А пасля награвання груер становіцца далікатным і цягучым — выдатная аснова для фандзю.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



— У нас распрацавана лінейка соусаў да сыроў. Да груеру падыдзе соус на аснове інжыру, — раіць суразмоўца.

Калі вы адэпт правільнага харчавання і лічыце сыр залішне каларыйным, то і такі запыт сучасны харчпрам у стане задаволіць. Тэхналогіі вырабу нізкатлустых сыроў прадставілі на «Прадэкспа-24» навукоўцы Інстытута мяса-малочнай прамысловасці калегам. А наведвальнікам — сыры, выраблены па гэтай тэхналогіі, на дэгустацыю.

— Тэхнолагам вядома, наколькі складана атрымаць смакавыя якасці і правільную кансістэнцыю сыру пры такой нізкай тлустасці (20 %), — тлумачыць **загадчык сектара навукова-тэхнічнага забеспячэння РУП «Інстытут мяса-малочнай прамысловасці» Надзея АНЦЫПАВА.** — Мы выкарыстоўвалі культуры, распрацаваныя ў нашым інстытуце, якія дазваляюць вытрымаць смакавыя якасці і патрабаванні кансістэнцыі ў сырах з нізкай тлустасцю, якія да таго ж адрозніваюцца хуткім выспяваннем — не больш за 20 сутак.

— Чаму пакупніку патрэбны і такія сыры?

— Сёння вялікі працэнт спажыўцоў (асабліва моладзь) імкнецца харчавацца правільна і не набіраць лішнюю вагу. Для іх і распрацаваны гэты прадукт. Яшчэ адна наша распрацоўка сумесна з ААТ «Малочны Свет» — безлактозны сыр, які стаў пераможцам рэспубліканскага конкурсу «Сто ідэй для Беларусі».

На іншых малочных прадуктах, у найшырэйшым асартыменце прадстаўленых на «Прадэкспа», спыняцца не будзем — распрацовак велізарнае мноства, у тым ліку ў сферы функцыянальнага харчавання (безлактозныя лініі, малочныя прадукты А2). У трэндзе ў вытворцаў малочныя кактэйлі — з рознымі смакамі (пераважае шакалад), у прывабных упакоўках. Прадукт пакуль новы для нашага спажыўца, але, здаецца, спадабаецца.

З экспартаарыентаванай прадукцыі цікавыя сухія малочныя кактэйлі і сухія сумесі для марожанага, распрацаваныя Інстытутам мяса-малочнай прамысловасці.

— Тэхналогія добра адчувае сябе ў экспартных пазіцыях, — распавяла Надзея Анцыпава. — Узбекістан, Азербайджан, атэлі Егіпта, дзе адпачываюць і нашы беларускія турысты. А тое, што вырабляе «Савушкін прадукт», можна пакаштаваць у Mak.by.

## ДОБРА ЗАБЫТАЕ СТАРОЕ

Развіццё гастранамічнага турызму — адзін з прыярытэтаў нашага часу. Попыт на дэгустацыйныя паездкі з году ў год расце па ўсім свеце (у сярэднім на 17 % у год, падлічылі эксперты), і нашай краіне таксама ёсць што прапанаваць турыстам. Пра гэта гаварылі эксперты на семінарах і круглых сталах «Прадэкспа-2024». А практыкі харчовай вытворчасці прадстаўлялі «аўтэнтыку» на стэндах і дэгустацыях. І тут немагчыма абыйсці ўвагай саленні і мачэнні ад «Белкаапсаюза»: ад марынаванага часнаку да мочаных яблыкаў. І, зразумела, агуркі-памідоры многіх відаў.

— Зялёныя марынаваныя памідоры ідэальныя для салянкі, вопытныя гаспадыні гэта ведаюць, — распавяла **галоўны тэхнолаг упраўлення прамысловасці і зверагадоўлі «Белкаапсаюза» Таццяна МАРТЫНОВІЧ.**

Магчыма, нехта з чытачоў памятае зялёныя памідоры яшчэ па савецкіх часах (у трохлітровым слоіку). Сёння ўпакоўка іншая, а рэцэпт адроджаны, і знаходзяцца прыхільнікі.



— Зрэшты, на салянку прыдатныя яшчэ бурыя памідоры, — працягвае суразмоўніца. — Іх рэзкі смак дадасць страве вастрыні і пікантнасці.

З прыходам зімы ў топе ў пакупнікоў — кіслая капуста, адзначае яна. Гэты ферментаваны прадукт — аснова моцнага імунітэту і правільнага стрававання, а вітаміну С у квашанай капусце больш, чым у лімоне. Спажывае яе маладое пакаленне з задавальненнем, а вось гатаваць, на жаль, многія развучыліся.

— Тут патрэбны і рукі, і, як кажуць, душа, — заўважае Таццяна Мартыновіч. — Гэта як з драджджавым цестам: у адных яно пышнае і прыгожае, а ў іншых не паднімаецца, як ні старайся. Вось і з квашанай капустай тое ж самае... Сучасныя гараджанкі аддаюць перавагу набыццю ў крамах. І купляюць, як правіла, менавіта ў нас.

А УП «Старадарожскі плодаагароднінны завод» прадставіў на дэгустацыю таматны сок з семечкамі з грунтавых памідораў — «такі, як гатавалі нашы бабулі», падкрэсліў **дырэктар прадпрыемства Дзмітрый БОНДАРАЎ.**

— Акрамя нас, з грунтавых памідораў у Беларусі ніхто больш сок не вырабляе, мы першыя, — дадаў ён.

У новага соку натуральны смак, а ў продажы ён з'явіцца з 1 снежня.

Дарэчы, сокамі лініі «арганік» (без солі і цукру) брэнда «СтаДар» зацікавіліся па выніках «Прадэкспа» не толькі ў краінах СНД.

— Кітайскія прадстаўнікі запрасілі нас на перагаворы ў індустрыяльны парк «Вялікі камень», намецілася супрацоўніцтва з рытэйлам з ЗША: на выставе прысутнічаў гандлёвы прадстаўнік гэтай краіны, — расказаў дырэктар.

А ў беларускіх і расійскіх гасцей выставы цікавасць падчас дэгустацый выклікала лінія варэння. Іх у брэнда «СтаДар» шэсць відаў: вішнёвае, клубнічнае, журавінавае, бруснічнае, чарнічнае і з буякоў.

— Гаспадыні, вядома, і ў нашы дні вараць варэнне. Але ў нас атрымліваецца дакладна не горшае, — адзначыў Дзмітрый Бондараў.

Сёлета «Прадэкспа» сабрала пад адным дахам 164 экспаненты. Нараўне з гігантамі былі і невялікія вытворчасці, і нават індывідуальныя прадпрымальнікі. **Міхаіл ЛУКАШЭНЯ, стваральнік брэнда «УГнядзе. Жывая ежа»**, вырабляе сыравыціснутыя алеі па старадаўняй тэхналогіі.

— Мы іх вырабляем у драўляных бочках, без кантакту з металам. Атрымліваем алей чыстым ціскам — той жа якасці, які змяшчаецца непасрэдна ў насенні. Гэта тлушчы нязменнай формулы, у спрадвечным выглядзе, — тлумачыць ён.

У асартыменце — больш за дзесяць відаў алеяў: ільняны, гарбузовы, кедравы, кунжутны, міндальны, алей грэцкага арэха і г. д.

## ЗДЗІВІЦЬ ПЕРАБОРЛІВАГА ПАКУПНІКА

Мясакамбінаты прапаноўваюць каўбасы з рознымі «дадаткамі»: ад журавін (што, зрэшты, беларускаму спажыўцу ўжо звыкла) і вішні да бульбы і печані.

З бульбай зрабіў Слонімскі мясакамбінат. Пакаштаваць не паспела — з'елі да мяне.

— «Наш бульбаш» на дэгустацыі выклікаў фурор. Сёння гэты прадукт ужо скончыўся, прыходзьце на дэгустацыю заўтра, — сказалі на стэндзе прадпрыемства.

Каўбаска з печанню — распрацоўка Ваўкавыскага мясакамбіната.

— Асабліва смачная яна ў гарачым выглядзе, прагрэтая ў духоўцы, — адзначыў прадстаўнік кампаніі. — Гэта зусім новы прадукт, але ён ужо ёсць у фірменных крамах.

А сыравяленую каўбасу з вішняй прыдумалі ў Пінску.

— «Фуршэтная» з дабаўленнем вішні, каўбаскі «Качыяторы» і «Чарыза» асабліва спадабаліся маладому спажыўцу, — сказала **спецыяліст ААТ «Пінскі мясакамбінат» Таццяна КУЛІШЭВІЧ.** — Прыемны момант — «рылсы», якія выкладала ў сацсетках аб нашай прадукцыі моладзь, што пабывала на дэгустацыях на нашым стэндзе.

Вытворцы прадуктаў харчавання гавораць: спажывец хоча, каб яго здзіўлялі. Проста каўбаса, нават з самага якаснага мяса, пакупнікам ужо не надта цікавая. Як і проста ёгурт, тварог, смятана, хлеб, марожанае... Яшчэ адна тэндэнцыя ў мясакамбінатаў: у топе — каўбасы і іншая прадукцыя з нетрадыцыйных для нашага спажыўца відаў мяса — труса, бараніны і ў першую чаргу з прамысловых жывёл.

— Актуальныя прадукты з дзічыны, — адзначыў **начальнік аддзела маркетынгу ААТ «Ваўкавыскі мясакамбінат» Віталь АЛЕШКА.** — У нас іх цэлая лінейка: у розных відах абсыпкі, з рознымі спецыямі, з аленя і казулі.

І, нарэшце, у гаспадынь папулярныя паўфабрыкаты ў марынадах: стэйкі і іншыя віды прадукцыі, якія дазваляюць эканоміць час каля пліты і без намаганняў ва ўласнай духоўцы атрымаць, па сутнасці, рэстаранную страву.

«Без намаганняў» — адзін з асноўных спажывецкіх запытаў, і вытворцы імкнуцца на яго адказаць. Так, у Брэсце прыдумалі «боршч у каўбасе»: адразаеш кавалак, кідаеш у каструлю і атрымліваеш паўнавартаснае «першае». А расійскія харчавікі прэзентавалі цэлую інавацыйную лінію страў у фармаце «дадай вады і разагрэй».

## СПАЖЫВАЕМ З КАРЫСЦЮ

Яшчэ адзін трэнд сучаснасці, зразумела, — правільнае харчаванне і здаровы лад жыцця. Гэта і мясная прадукцыя з паніжаным (на 30 %) утрыманнем солі для здароўя сэрца і сасудаў, распрацоўка Інстытута мяса-малочнай прамысловасці, і сасіскі-каўбасы для дзяцей з павышаным індэксам масы цела (таксама ад вучоных ІММП). Гэта і лінейка «Рознае карыснае» ад брэнда «Гаспадар» (Баранавіцкі камбінат хлебапрадуктаў): пшанічныя зародкавыя шматкі, клятчатка, пшаніца і грэчка для прарошчвання (парасткі карысна дадаваць у салаты, асабліва зімой). І, вядома, гэта кашы (што патрабуюць і не патрабуюць варкі) з рознымі дадаткамі.

— Пакупнікам спадабаўся наш прадукт «Асарці агародніннае», і мы распрацавалі навінку — папрыка-цыбуля-грэчка, — расказала **прадстаўнік ААТ «Гомельхлебпрадукт» Вікторыя БАНДАРЭНКА.** — Яе пакуль няма на прылаўках, але з'явіцца ў крамах у найбліжэйшы час. Яшчэ адна распрацоўка, спецыяльна для нашага беларускага спажыўца, — аўсяныя шматкі «брусніцы-чарніцы-журавіны».

— У беларускага пакупніка нейкія асаблівыя перавагі?

— Нашым спажыўцам важна, каб у прадукце было больш айчыннай сыравіны: «беларускае» — значыць «якаснае». Людзі хочуць шматкі з гарбузом, з лёнам. Ананасам, бананам і манга ўжо нікога не здзівіш.

Аб велізарным асартыменце кандытарскіх навінак, прадстаўленых на «Прадэкспа» сёлета, варта, мабыць, распавесці асобна. Пакуль толькі скажам, што тэндэнцыі правільнага харчавання закранулі і кандытарскую сферу. Так, напрыклад, ААТ «Спартак» стварыў інавацыйную лінію шакаладу без цукру, якая ўжо заваявала сэрцы спажыўцоў.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ
В ФОРМЕ ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА НА ПОВЫШЕНИЕ ЦЕНЫ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ЗАО «Цептер Банк», г. Минск, ул. Платонова, 1Б. УНП 807000214 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, 40, пом. 46, оф. 1. УНП 191224638 (**www.ipmtorgi.by)** |

**Предмет электронного аукциона**

## Здание швейного раскройного цеха

(**785,20 кв. м,** инв. № 611/С-190).
**Адрес: Минская обл., Березинский р-н, г. Березино, ул. Мультана, 62В**

***Сведения о земельном участке***: пл. 0,2927 га предоставлен на праве аренды (срок действия по 02.08.2062) для размещения объектов неустановленного назначения (обслуживания здания швейного и закройного цеха). Ограничения (обременения): охранная зона линий электропередачи напряжением свыше 1000 вольт (пл. 0,0374 га)

**Начальная цена лота (без НДС) – 109 954,31 бел. руб.**

**Примечание: цена продажи лота указывается в договоре купли-продажи с учетом НДС*

**Задаток 1 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати)** календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by.
Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by.
Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить **вознаграждение организатору торгов по лотам 3 %** от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 26.12.2024 с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 24.12.2024 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны**: +375 (17) 310-36-37; +375 (29) 154-34-35.
**E-mail:** auction@cpo.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ
ПОВТОРНОГО ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие
«Минский областной центр инвестиций и приватизации»
*(организатор торгов и оператор электронной торговой площадки: torgi.rlt.by, место нахождения: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321)*
по поручению **ОАО «Молодечненский райагросервис»**
(продавец, *место нахождения: Минская область, г. Молодечно, ул. Лебедевская, 8*)
**проводит повторный открытый аукцион по продаже:**

## Лот № 1: легковой автомобиль VAZ 21214,

**2007 г. в., цвет – темно-зеленый, 2007 г. в., номер кузова (VIN) XTA21214071858404, рег. знак 9549 НР-5.**

**Начальная цена с НДС (20 %) – 3 960,00 бел. руб.**
**Задаток 10 % от начальной цены – 396,00 бел. руб.**

## Лот № 2: трактор К-744Р,

**2006 г. в., рег. знак ОО-5 0334, инв. № по бух. учету 90261, зав. № 050778.**

**Начальная цена с НДС (20 %) – 92 520,00 бел. руб.**
**Задаток 10 % от начальной цены – 9 252,00 бел. руб.**

**Объекты находятся по адресу:**
**Минская обл., г. Молодечно, ул. Лебедевская, 8.**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 20 (двадцати) рабочих дней с даты проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Организатор торгов имеет право отказаться от их проведения: в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона.

**Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона оплачивает вознаграждение в следующем размере: по лоту № 1 – 10 (десяти) процентов от цены продажи предмета аукциона, по лоту № 2 – 3 (трех) процентов от цены продажи предмета аукциона, а также возмещает затраты на публикацию извещения о проведении торгов.**

Электронные торги проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608 и регламентом электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», размещенным по адресу: torgi.rlt.by.

Электронные торги состоятся **09.12.2024** в **10.00**. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **06.12.2024** до **17.00.**

**Тел. организатора торгов: (8017) 516-80-65, (8029) 136-31-11.**
**Тел. для осмотра: (8033) 340-21-83.**
**Информация о торгах опубликована на сайтах: minsk-region.gov.by, torgi.rlt.by.**

УНН 600077381

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже земельных участков в частную собственность

**Организатор электронных торгов: Голоцкий сельский исполнительный комитет**, Минский область, Пуховичский район, **аг. Голоцк, ул. Центральная, 11,** тел.: (801713) 68589, 68636, 68799.
**Оператор электронной торговой площадки:** открытое акционерное общество «Белорусская универсальная товарная биржа»
**Электронный адрес электронной торговой площадки:** www.et.butb.by
**Дата проведения электронных торгов: 23 декабря 2024 г.**
**Время проведения электронных торгов устанавливается** ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа» на электронной торговой площадке «БУТБ-Имущество»

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер; целевое назначение земельного участка; вид права | Площадь земельного участка, *га* | Инженерная инфраструктура (возможность подключения) | Начальная цена, *руб* | Задаток, *руб.* | Расходы по подготовке, *руб.* |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Минская область, Пуховичский р-н, аг. Голоцк, ул. Народная, 65А | 624482501601000529, строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома; частная собственность | 0,1702 | Сети электроснабжения, газоснабжения, водоснабжения | 17649,74 | 1764,97 | 3005,86 |
| 2 | Минская область, Пуховичский р-н, д. Хозянинки, ул. В. Мысливца, уч. 24 | 624482506101000226, строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома; частная собственность | 0,14 | Сети электроснабжения, газоснабжения, водоснабжения | 9898,00 | 989,80 | 2595,29 |
| 3 | Минская область, Пуховичский р-н, д. Моторовщина, ул. Трудовая, 53 | 624482503601000141, строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома; частная собственность | 0,147 | Сети электроснабжения, газоснабжения, водоснабжения | 7732,20 | 773,22 | 2943,70 |

**Задаток для участия в электронных торгах перечисляется** на расчетный счет № BY60AKBB30120000066940000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск код банка AKBBBY2X, УНП 190542056, получатель платежа – ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа».

**Срок внесения задатка –** до подачи заявления на участие в электронных торгах. **Назначение платежа:** внесение суммы задатка на участие в торгах. **Окончание приема заявлений на участие в электронных торгах** с прилагаемыми к ним документами – **18 декабря 2024 г. до 15.00.**

Лицо, желающее принять участие в электронных торгах, в отношении нескольких предметов электронных торгов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из этих предметов торгов. Оплата стоимости предметов торгов осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время либо с участием представителя организатора в рабочее время (понедельник–пятница, 8.30–13.00, 14.00–17.30).

